*Цімашэнка Л.У.*

# КНЯЗЬ ВАСІЛЬ-КАНСТАНЦІН АСТРОЖСКІ І БРАЦКІ РУХ У КІЕЎСКАЙ МІТРАПОЛІІ (АПОШНЯЯ ТРЭЦЬ XVI – ПАЧАТАК XVII ст.)

Асоба князя Васіля-Канстанціна Астрожскага, нягледзячы на пастаянную ўвагу да яе на працягу стагоддзяў, захоўвае лакуны, да якіх, перш за ўсе, патрэбна аднесці шматгранную рэлігійную дзейнасць ахоўніка Праваслаўя. Розныя аспекты рэлігійнай дзейнасці Васіля-Канстанціна Астрожскага актыўна абмяркоўваліся ў літаратуры, пачынаючы з канца XIX ст. [гл.: 1–11 і інш.]. У гістарыяграфіі брацкага руху, які таксама з'яўляецца адным з актуальных пытанняў гуманітарнай навукі Усходняй Еўропы ранняга Новага часу. Гістарыяграфія брацтваў даследуемага перыяду ў сувязі з генезісам Берасцейскай уніі разгледжана намі ў асобным артыкуле [12]. Сведчаннем актуальнасці праблемы ў сучаснай гістарыяграфіі з'яўляюцца найноўшыя манаграфічныя даследаванні [гл.: 13–15]. Але асноўныя моманты сувязяў Васіля-Канстанціна Астрожскага з брацкім рухам толькі згадваюцца.

Гісторыя царкоўных брацтваў у Кіеўскай мітраполіі ўтрымлівае ў сабе значную колькасць дыскусійных пытанняў. Так, у літаратуры неадназначна трактуюцца праблемы, звязаныя з паходжаннем брацтваў, іх тыпалогіяй, наданнем стаўрапігіяльных правоў, канфліктам з іерархіяй, прычынам трывалай і жорсткай барацьбы супраць уніі. На нашу думку, да сённяшняга часу адсутнічае поўная статыстыка брацкага руху, а сучасная гістарыяграфія працягвае пакутаваць ад цяжкай спадчыны атэістычнага мінулага, калі было зроблена ўсё магчымае, каб адлучыць гісторыю брацкага руху ад гісторыі царквы. Мяркуем, што трэба зыходзіць з таго, што самі брацтва былі рэлігійнымі арганізацыямі вернікаў, а ў іх гісторыі свецкія формы дзейнасці былі толькі аднымі са складальнікаў, якія характарызуюць даволі багатыя і разнастайныя формы і праявы брацкага руху. Сёння таксама зразумела, што брацкі рух быў даволі неаднароднай з'явай і захаваў значныя адрозненні царкоўна-юрыдычнага, рэлігійна-культурнага і рэгіянальнага характару. Напрыклад, А. Міранові̇ч лічыць, што ў адрозненні ад Украіны, на тэрыторыі Беларусі было менш брацтваў, значна меншым было і іх грамадскае значэнне, але

яны таксама адыгралі істотную ролю ў абароне Праваслаўя ад уніі [16, с. 216]. Да гэтага часу дакладна не высветлена праблема ролі свецкіх магнатаў у брацкім руху, акрамя абаронцы Праваслаўнай царквы Васіля-Канстанціна Астрожскага.

Цікавым, перш за ўсе, з'яўляецца пытанне пра самыя раннія звесткі аб падтрымцы Васілём-Канстанцінам Астрожскім дзейнасці брацтваў. Напрыклад, вядомым лічыцца факт асабістага звароту князя ў 1592 г. (разам з Ф. Скумінымь-Тышкевічам) да Жыгімонта III Вазы з просьбай зацвердзіць патрыяршую стаўрапігію Львоўскага брацтва, а таксама права на адкрыццё школы і друкарні (што знайшло сваё адлюстраванне ў двух граматах Жыгімонта III Вазы ад 15.10.1592 г.) [17, № 251, с. 388, № 252, с. 390; 18, с. 54–56; 19, с. 45, 84; 20, с. 108–110]. Думка С. Лукашовай пра тое, што патрыяршая стаўрапігія львоўскага брацтва парушала права кіеўскага ваяводы, не мае відавочнага пацверджання [14, с. 234–235]. Відавочна, зусім невыпадкова найбольшую ўвагу князь надаваў менавіта Львоўскаму брацтву. Дарэчы, тэма сувязі князя з Львоўскім брацтвам мае даволі даўнюю гістарыяграфічную традыцыю. Дастаткова ўзгадаць адну з першых крыніцазнаўчых публікацый Я. Галавацкага, які яшчэ ў 1866 г. апублікаваў дванаццаць лістоў князя, якія зберагаліся ў архівах Успенскага брацтва, у тым ліку і да львоўскіх братчыкаў [21]. Але публікацыя аўтарам дакументаў Васіля-Канстанціна Астрожскага выйшла за межы акрэсленай тэмы, пазней дакументы да гісторыі брацтва былі перадрукаваны ў іншых корпусных выданнях крыніц.

Першым дакументальна зафіксаваным фактам сувязі Васіля-Канстанціна Астрожскага з Львоўскім брацтвам з'яўляецца ліст ад 25 сакавіка 1588 г., у якім князь намагаўся прымірыць брацтва з Гедэонам Балабанам: як бачна з тэксту, за дапамогай звярнулася само брацтва, якое выслала да князя свайго прадстаўніка, Васіль-Канстанцін Астрожскі меў намер запрасіць да сябе епіскапа і прадстаўніка брацтва і памірыць варагуючыя бакі [22, № 179, с. 468–471; 23, № 97, с. 152–153]. У апошні раз ён звяртаўся да брацтва 1 сакавіка 1607 г. па справе элекціі новага епіскапа [24, № 170, с. 257–258]. Напрыканцы 80-х – напачатку 90-х гг. XVI ст. актуалізавалася пытанне пра фундатарства/кціtарства князем львоўскага манастыра Св. Ануфрыя [7, с. 97–98], які, як вядома, быў аб'ектам спрэчак паміж брацтвам і львоўскім епіскапам. Падаецца, што пэўныя падставы ў правах на манастыр у князя былі: у 1585 г.

ён загадаў адбудаваць за яго кошт значную частку манастыра, які згарэў пад час пажару 1580 г. (манастыр заставаўся пад апекай брацтва). Інспіраваў справу Гедэон Балабан, які 13 ліпеня 1589 г. намагаўся давесці праз ігумена Унеўскага манастыра С. Барашоўскага, што фундатарам Ануфрыеўскага манастыра быў яшчэ нябожчык князь Канстанцін Іванавіч Астрожскі. Яго сын у час праўлення Стэфана Баторыя працягваў гэтую справу. Адсюль епіскап выводзіў сваю юрысдыкцыю на манастыр [17, № 111, с. 174; 14, с. 212][1]. Цікава, што ў справу ўмяшаўся патрыярх Іерэмія II Транос, які ў грамаце ад 26 жніўня 1589 г. абверг фундатарскія правы князёў Астрожскіх, так як гэта прадстаўляў Гедэон Балабан. Пасля манастыр мог застацца "пад благаславеннем" мітраполіі (на самой справе – замацоўваўся за брацтвам) [17, № 25, с. 199]. У выніку справа была агучана на Берасцейскім саборы 1590 г., які разглядаў канфлікт паміж брацтвам і епіскапам. Сінадальная грамата 22 чэрвеня 1590 г. асудзіла Гедэона Балабана, які нібыта захапіў манастыр, "атрымаўшы" ад караля прывілей "за прычынаю" князя Васіля-Канстанціна Астрожскага [17, № 159, с. 255].

Як вядома, барацьба брацтва супраць львоўскага ўладыкі скончылася поўным паражэннем апошняга (прыведзенае сцвярджэнне (нібыта відавочнае) аргументавана паказала С. Лукашова, якая дакладна прасачыла этапы і змест канфлікту епіскапа з брацтвам) [14, с. 204–225; 25, с. 36–52]. У апошні раз пытанне кцітарства над манастыром згадваецца ў лісце кагосьці з найбліжэйшага атачэння князя да братчыкаў ад 24 верасня 1596 г., у якім асуджаліся паводзіны брацтва, якое не жадала паказаць Васілю-Канстанціну Астрожскаму прывілей патрыярха на адлучэнне князя ад кцітарства [17, № 427, с. 739]. Здаецца, што апекаванне князем Васілём-Канстанцінам Астрожскім манастыра Св. Ануфрыя не мела афіцыйнага характару, ці, прынамсі, не было своечасова дакументальна аформлена. Але, праблема не мела значнага ўплыву на стасункі князя з брацтвам.

Цікавым таксама з'яўляецца пытанне, на чыім баку ў канчатковым выніку апынуўся Васіль-Канстанцін Астрожскі ў барацьбе Львоўскага брацтва з епіскапам Гедэонам Балабанам. Як справядліва заўважыў К. Лявіцкі, адносіны князя да канфлікту былі паслядоўнымі і прадметнымі: відавочна не падтрымліваючы ні адзін

[1] Аналізуючы сітуацыю канфлікту, у тым ліку і пытанне кцітарства, С. Лукашова безпадстаўна гаворыць аб тым, што Гедэон Балабан здолеў у 1589 г. атрымаць прывілей на манастыр ад князя.

з бакоў, ён бесперапынна намагаўся змякчыць канфлікт [2, с. 108]. Меркаванне Я. Ісаевіча што князь Васіль-Канстанцін Астрожскі стаў на бок Гедэона Балабана, а не брацтва, крыніцамі не пацвярджаецца [26, с. 48]. Цікава, што нягледзячы на нейтральную пазіцыю да моманту прымірэння з епіскапам (у 1596 г. у Астрозе паміж брацтвам і ўладыкам было падпісана мірнае пагадненне аб спыненні варожых і судовых спраў паміж бакамі, у выпадку парушэння згоды адным з бакоў прадугледжвалася пакаранне штрафам у памеры 1000 злотых), князь звяртаўся да Львоўскага брацтва з вялікай павагай і сімпатыяй [15, с. 418–419]. Вядома і яго пазіцыя адносна абароны брацтва і львоўскіх мяшчан ад уціскаў польскай адміністрацыі Львова на розных узроўнях. На маю думку, сама культурна-асветніцкая і рэлігійная дзейнасць Львоўскага брацтва была блізкай Астрожскаму, які сам зрабіў гэты напрамак вызначальным у сваёй праграме адраджэння Русі.

У старой гістарыяграфіі выказвалася думка, што князі Астрожскія былі сябрамі Львоўскага брацтва (першым быў, здаецца, Я. Галавацкі [21, с. 67, 69]). Паколькі згаданы тэзіс патрабаваў пацвярджэння ў крыніцах, дапускалася, што братчыкі падзяляліся на дзве катэгорыі: пачэсных і рэчаісных. Адпаведна, князю Васілю-Канстанціну Астрожскаму адводзілася роля пачэснага братчыка (пазней такім самым пачэсным членам брацтва быў быццам бы гетман П. Сагайдачны) [27, с. 66][2]. Аднак Я. Ісаевіч справядліва звярнуў увагу на той факт, што нават запісаныя ў 1593 г. у Львоўскае брацтва магнаты не былі яго дзеючымі членамі [26, с. 48]. Акрамя таго, выяўлены рэдкія выпадкі, калі нават старэйшыны Львоўскага брацтва з-за нейкіх прычын не былі ўпісаны ў брацкі рэестр (напрыклад, у 1602 г. старэйшына С. Луцкий, у 1604 г. Бартнікевіч і інш.) [27, с. 66]. Акрамя сказанага, у вядомых мне спісках членаў Львоўскага брацтва імя Васіля-Канстанціна Астрожскага не згадваецца [28, с. 90–91; 29, с. 81–91; 30, с. X–XII].

Прывяду іншыя яскравыя моманты, якія адлюстроўваюць сувязі князя з Львоўскім брацтвам. 1 снежня 1592 г. Васіль-Канстанцін Астрожскі ў вельмі давернай форме звяртаўся да львоўскіх братчыкаў за дапамогай у справе свайго сына Аляксандра, які пад уплывам езуітаў здзейсніў канверсію ў каталіцтва [17, с. 401]. Падтрымліваючы Львоўскае брацтва, князь абараняў

[2] У той самы час даследчык не прыводзіць імёнаў тых “пачэсных” членаў у рэестры і іх біяграмы за 350 гадоў яго існавання, дадзеных да яго публікацыі.

яго інтарэсы, але напярэдадні Берасцейскага сабора 1596 г. сітуацыя змянілася. Львоўскае брацтва сканцэнтравалася на барацьбе з гарадской уладай Львова і канвентам мясцовых дамініканцаў [2, с. 118; 31, с. 108–113]. Цікава, што ў красавіку 1595 г. у абарону брацтва выступілі князі Адам Вішнявецкі і Кірык Ружынскі. Адначасова, ліст-папярэджанне да львоўскіх членаў магістрату напісаў Васіль-Канстанцін Астрожскі [31, с. 112]. Дарэчы, дзякуючы намаганням Астрожскага, епіскап Гедэон Балабан і брацтва (не так даўно – варагуючыя бакі) увайшлі ў адзіны антыуніяцкі лагер. Такім чынам, брацтва мела шырокае прадстаўніцтва на праваслаўным саборы 1596 г. (яно было прадстаўлена чатырма свецкімі дэлегатамі: Іванам Рагацінцам, Юрыем Рагацінцам, Мікалаем Дабранскім і Дзмітрыем Красоўскім). Як бачна, сувязі князя Васіля-Канстанціна Астрожскага з Львоўскім брацтвам грунтаваліся на агульных стратэгічных інтарэсах, звязаных не столькі з барацьбою брацтва з епіскапам Гедэонам Балабанам, колькі з арганізацыяй шырокага блоку супраць уніі [32, № VI, с. 18–19][3].

Васіль-Канстанцін Астрожскі ў лістах часта звяртаўся да львоўскіх братчыкаў у шаблоннай форме. Так у лісце да брацтва ад 12 студзеня 1599 г.: “Мои милые панове мещане львовские!” [17, № 471, с. 812]. Ён таксама інфармаваў брацтва пра тыя ці іншыя падзеі, якія датычыліся абароны правоў львоўскіх мяшчан, а таксама ўсёй праваслаўнай супольнасці. Так, у лісце ад 17 мая 1600 г. князь абмяркоўваў з братчыкамі падзеі на апошнім вальным сейме, выступлення там супраць праваслаўных, а таксама тактыку, якой патрэбна было прытрымлівацца на шляхецкіх сейміках [17, № 447, с. 852]. Князь таксама шырока карыстаўся патэнцыялам Львоўскага брацтва. Так, 17 ліпеня 1602 г. на яго просьбу Успенскае брацтва паслала Астрожскай друкарні грэчаскі шрыфт і накіравала туды ж друкара Касіяновіча для выдання прац александрыйскага патрыярха Мялеція Пігаса (гл. апошняе выданне ліста Васіля-Канстанціна Астрожскага [ 20, с. 127; 15, с. 211]).

Яшчэ адно брацтва, у падтрымку якога выступіў Васіль-Канстанцін Астрожскі, дзейнічала ў недалёкім ад Астрога Любліне пры царкве Прэабражэння (Спаса) Госпадняга. Час яго засна-

[3] Гл., напрыклад, ліст князя Львоўскаму брацтву ад 20 кастрычніка 1603 г., у якім гаворыцца пра ўціск праваслаўных, а таксама пра дапамогу брацтву. У пачатку XVII ст. князь усё зрабіў для прымірэння епіскапа і брацтва, але ж, гэта было на карысць барацьбы супраць уніі (прымірэнне было афіцыйна зацверджана 21 студзеня 1602 г. пры пасрэдніцтве малдаўскага лагафета Лукі Стройча).

вання даследчыкі традыцыйна адносілі да 1594 г., калі па просьбе мітрапаліта Міхаіла Разгозы Жыгімонт III Вазы зацвердзіў статут і права арганізацыі мясцовых свецкіх асобаў [14, с. 304; 26, с. 37]. У апошні час згаданая пазіцыя значна ўдакладнена, згодна з чым заснаванне брацтва адносяць да канца 80-х гг. XVI ст. (гл. дакладную аргументацыю з адпаведнымі архіўнымі пацверджаннямі [33, с. 45]). Князь Васіль-Канстанцін Астрожскі, які часта бываў у Любліне (тут засядаў Каронны трыбунал, адбываліся агульнадзяржаўныя сеймы), меў сувязі з мясцовай рускай грамадою. Такім чынам, князь выступіў на падтрымку мясцовага брацтва: 5.05.1601 г. разам з Рыгорам Сангушкам і Іакімам Карэцкім на чале вялікай групы валынскай шляхты, якая абяцала ахову і апеку інтарэсаў брацтва, а таксама матэрыяльную падтрымку братчыкам [33, с. 45 (спасылка 33); 34, с. 397–400].

Васіль-Канстанцін Астрожскі меў кантакты з Віленскім Свята-Троіцкім праваслаўным брацтвам. Даследчыкі гісторыі віленскіх брацтваў перакананы, што князь запісаўся разам з іншымі вядомымі прадстаўнікамі шляхты і магнатэрыі у сябры брацтва Святой Троіцы яшчэ да Берасцейскага сабора 1596 г. [35, с. 49]. Між тым у вядомым рэестры сябраў брацтва разам з імёнамі літоўска-рускай магнатэрыі і шляхты яго імя не значыцца (пералік членаў Віленскага брацтва, незважаючы на больш раннюю дату, засведчаны мітрапалітам Міхаілам Рагозай) [36]. Спісак інструкцый на сабор 1594 г., які падпісалі вядомыя літоўскія магнаты, таксама князем не падпісаны [37, № 168, с. 77].

Кантакты Васіля-Канстанціна Астрожскага з Віленскім брацтвам фіксуюцца яшчэ ў даберасцейскі перыяд, прычым яны актывізаваліся на аснове агульных інтарэсаў у барацьбе з уніяй. Так, яшчэ ў 1595 г. віленскія братчыкі прасілі князя пахадайнічаць перад каралём аб скліканні сабора для вырашэння пытання аб адступніках ад Праваслаўя [24, № 74, с. 105]. Яны прымалі ўдзел у саборы 1596 г. выключна на баку праваслаўных (брацкія святары Васіль Троіцкі і Герасім Накрывайла, дзевяць братчыкаў) [38, с. 180]. Віленскія братчыкі падтрымалі князя на сходзе з пратэстантамі ў Вільне ў 1599 г. [8, с. 155–156; 35, с. 50]. Новаму уніяцкаму мітрапаліту Іпацію Пацею, які распачаў сваё праўленне над мітраполіяй узмацненнем уціску на віленскіх праваслаўных, не падабалася падтрымка князем Васілём-Канстанцінам Астрожскім мясцовага брацтва. Так, у лісце ад 1 чэрвеня 1601 г. да Мікалая Крыштафа Радзівіла ён згадваў факт паездкі ў Львоў дэлегацыі віленскіх мяшчан, якая пры-

везла нейкі прывілей, зацверджаны ці то Канстанцінопальскім, ці то “Валынскім” патрыярхам (з гэтай непрыхаванай іроніі ўсе ж такі бачна, што Іпацій Пацей разумеў ролю Астрожскага ў Праваслаўнай царкве) [39, с. 160].

У сувязі з тым, што мясцовае праваслаўнае брацтва ў 1597 г. распачала будаўніцтва царквы Святога Духа, Васіль-Канстанцін Астрожскі ў 1604 г. падарыў яму маёнтак Славенск. Гэты факт пацвярджаецца ў лісце І. Пацея да Л. Сапегі [40, № 538, с. 438]. Праз некалькі месяцаў пасля смерці Васіля-Канстанціна Астрожскага брацтва дало бліскучую характарыстыку яго дзейнасці на карысць Праваслаўнай царквы [41, стб. 1153–1154]. Далей праваслаўнае брацтва Святога Духа працягвала звяртацца да Януша Астрожскага (напрыклад, перад соймам 1608 г. братчыкі звярнуліся па дапамогу ў справе канфлікту з мітрапалітам І. Пацеем) [42][4].

Адным з нявырашаных застаецца пытанне аб тым, чаму ў маёнтках Васіля-Канстанціна Астрожскага пры яго жыцці не былі заснаваны брацтвы (прынамсі, гэта датычыцца тэрыторыі Луцка-Астрожскай епархіі, межы якой практычна супадалі з абшарам княжацкіх уладанняў). У выніку распрацоўкі праблемы, знойдзена адзінае сведчанне пра заснаванне князем брацтва ў Цярнопалі [26, с. 24; 43, с. 37–40; 44, с. 46][5]. Цікава, што Цярнопаль належаў да маёнткаў князя [45, с. 74], яго мясцовыя цэрквы ўваходзілі ў склад Львоўска-Камянецкай епархіі (дадзеныя візітацыі за 1732–1733 гг.) [46, с. 105]. Васіль-Канстанцін Астрожскі ў 1567 г. атрымаў Цярнопаль пасля шлюбу з С. Тарноўскай. У склад маёнтка ўваходзіў горад, фальварак і дзесяць вёсак. Да 1603 г. маёнткам кіраваў Аляксандр Астрожскі. Пры падзеле спадчыны Астрожскіх у 1603 г., цярнопальскі маёнтак дастаўся сыну князя Янушу. Пазней ён перадаваўся ў спадчыну ўнукам Васіля-Канстанціна Астрожскага. Пры больш падрабязным вывучэнні праблемы высвятляецца, што Васіль-Канстанцін Асторжскі тройчы фундаваў мяшчанскую арганізацыю міран у Цярнопалі [47, Воп. 1, Спр. 891]. Крыніцы фундацыі Васілём-Канстанцінам Астрожскім брацтва ў Цярнопалі ў першы раз былі апісаны згаданым О. Терлецкім. У пачатку XX ст. яны захаваліся ў архіве «Заведення князя Острозького в Тернополі». Гаворка вядзецца пра дзве граматы: 1560 і 1593 гг. Першая была арыгіналам з аўтографам князя, другая – тагачаснаю копіяй. Сучаснае месцазна-

[4] Пададзеная інфармацыя атрымана ад Т. Кемпа, за што яму вялікая падзяка.

[5] Згаданы факт заснавання брацтва не ўвайшоў у манаграфію С. Лукашовай.

ходжанне апісаных крыніц/дакументаў не вядома. У Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве Украіны ў Львове захоўваюцца копіі згаданых крыніц, зробленыя ў міжваенны перыяд.

Прааналізаваны дакументы-фундушы датаваныя 1560, 1570 і 1593 гг. З прычыны таго, што цярнопальскі маёнтак дастаўся Васілю-Канстанціну Астрожскаму ў спадчыну ад памерлай жонкі Сафіі Тарнаўскай у 1567 г. (апошнім уладальнікам Цярнопаля з роду Тарнаўскіх быў Ян Крыштаф “Амор”), а ў перыяд з 1579 па 1594 гг. усе правы на Цярнопаль належалі (як спадчына ад маці) яго сынам, то тут узнікаюць цалкам справядлівыя сумненні (да храналагічных неадпаведнасцяў можна дадаць моўныя – крыніца ж напісана па-польску). Звяртаю ўвагу на тую акалічнасць, што сын князя Януш згадваецца ў дакуменце 1593 г., а сын Аляксандр – у дакуменце пра пабудову царквы пад 1602 г. Трэба зазначыць, што Цярнопаль, заснаваны ў 1540 г. вялікім каронным гетманам Янам Тарноўскім, прывілеям ад 1548 г. атрымаў магдэбургскае права, пацверджанне і дазвол 1550 і 1574 гг. [48, с. 188, 189]. Як вядома, у гарадах, якія валодалі магдэбургскім правам, дзейнічаў так званы мяшчанскі патранат над цэрквамі, які адрозніваўся ад прыватнага (шляхецка-магнацкага). Прыкметнай рысай брацкага руху ў XVI ст. было ўзнікненне брацтваў менавіта ў гарадах з мяшчанскай формай патранату[6]. Магчыма, у выпадку Цярнопаля мы маем справу сумяшчэння дзвюх форм патранату.

Фундушам, датаваным 3 верасня 1560 г. (крыніца з’яўляецца незасведчанаю копіяй, зробленай з запісу ў цярнопальскіх магістрацкіх кніг ад 4 лютага 1792 г.), Васіль-Канстанцін Астрожскі ў адказ на просьбу цярнопальскіх мяшчан надаў “права” мясцовай царкве Нараджэння Хрыстова [47, воп. 1, спр. 891, арк. 5–6]. Згаданае наданне цікава ва ўсіх адносінах. Карыстаючыся неабмежаваным правам патранату, Астрожскі дазволіў сабе “поставити” святара, дыякана, дзяка і прасвірніка. Прад’яўляліся патрабаванні да святара: “абы быў прыстойны і пільны да службы Божай, і вучыў людзей як належыць па-хрысціянску”. У той самы час, святар мог быць епіскапскім

[6] Гл. даклад: Заикин В. Участие светского элемента в церковном управлении, выборное начало и «соборность» в Киевской митрополии в XVI и XVII веках. Варшава, 1930 (гэтаму пытанню прысвечаны сёмы раздзел працы «Опіка православного міщанства над церквами у містах», с. 43-48); Тимошенко Л. Парафіяльне і братське самоврядування Київської митрополії в добу Берестейської унії (друга половина XVI–XVII ст.) // Рыхтуецца да друку в зборніку матэрыялаў Міжнароднай навуковай канферэнцыі ў Люблінскім універсітэце Марii Складоўска-Кюры.

пратапопам ці намеснікам. Паколькі такі святар належаў усе ж такі да епархіяльнай улады, князь прадугледзеў зносіны з львоўскім епіскапам. Вельмі характэрна, што ніхто не мог "адхіліць" святара. Значным таксама з'яўляецца ўказанне аб заснаванні шпіталю для "ўбогіх", для якога выдзяляліся дзве "пашні" поля за горадам (з дакладным апісаннем іх межаў). Для дагляду, кіраўніцтва і пільнавання за выкарыстаннем грунту прызначаўся ўраднік, "дазорца князя". Усім царкоўным прычтам, а таксама шпіталем магла кіраваць і загадаваць арганізацыя міран з васьмі асоб (імёны пералічваюцца). Фактычна, вядзецца гаворка пра адных і тых жа асоб: ураднікі, дазорцы князя і згаданая "васьмёрка" – гэта сінонім для абазначэння міранскай арганізацыі. Паўнамоцтвы яе членаў дакладна прапісаны: распараджацца шпітальнымі надзеламі і царкоўнымі рэчамі (срэбрам, апаратам і "пышнасцямі"). У выніку смерці аднаго з сябраў арганізацыі, абшчына павінна яго замяніць шляхам выбараў. Эканамічная незалежнасць міранскай арганізацыі была дасягнута шляхам вызвалення ад усіх гарадскіх падаткаў. У той жа час, "патроны ці дазорцы" павіны былі рабіць справаздачу аб царкоўных даходах і выдатках. Міранская арганізацыя распараджалася яшчэ адной гарадской царквой Уздвіжання Пачэснага Крыжа.

Звяртаю ўвагу на тое, што ў крыніцы не ўжываецца тэрмін "брацтва". Таксама, ён адсутнічае ў наступных дзвух дакументах. Тым не менш, гаворка вядзецца пра брацкую міранскую арганізацыю, не зважаючы нават на адсутнасць ва ўсіх аналізаваных крыніцах узгадак пра статут. Цікава, што першы даследчык гісторыі брацтва О. Цярлецкі без усялякага засцеражэння назваў арганізацыю брацтвам: на яго думку, з'явіўся "рід братства церковно-добродійного" ў Цярнопалі [43, с. 38]. Нават без інфармацыі пра брацкі статут, у крыніцах адзначаны дакладныя статутныя палажэнні брацкай арганізацыі: выбарнасць і падсправаздачнасць сябраў, іх абавязкі адносна царкоўнай маёмасці, шпіталя і надзелаў, пэўная незалежнасць святара, кантроль над усім царкоўным прычтам з боку "васьмёркі" і інш. Фактычна, князь Васіль-Канстанцін Астрожскі фундаваў арганізацыю міран з пакуль яшчэ недакладнымі рысамі стаўрапігіі.

Другі фундуш не захаваўся. Калі ў 1593 г. брацтва ў чарговы раз звярнулася да князя, то яно аргументавала, што папярэдні прывілей, менавіта 1570 г., згубіўся. Такім чынам, у прывілеі 1593 г. высветлены змест надання 1570 г. [47, воп. 1, спр. 891, арк. 7зв.–8]. Таксама ў ім вялася гаворка пра фундуш для "саборнай" царквы Нараджэн-

ня Хрыстова з зацвярджэннем васьмі “дазорцаў”, “старшых”. З гарадской арэнды ім прызначалася 10 злотых кожны год на шпіталь, пацвярджалася наданне надзелаў. Да новых абавязкаў належала кіраваць, разам са шпіталем, школай і царкоўнымі служкамі: дыяканам, дзякам, “витрикушем”, прасвірніцай. Пацвярджаўся і парадак выбараў. У пераказе зместу надання 1570 г. не абумоўлена становішча святара.

Трэцяе (і апошняе) наданне датавана 4 верасня 1593 г. (крыніца з’яўляецца копіяй з копіі 1735, засведчана 1743 г.) [47, воп. 1, спр. 891, арк. 7 зв.–9]. Перш за ўсё, у ім сцвярджаецца, што Цярнопаль ужо знаходзіўся ва ўладанні Януша Астрожскага. Разам з пацверджаннем старых правоў на матэрыяльную падтрымку царквы і брацтва, колькасць арганізацыі павялічвалася да дзесяці (іх спіс таксама прыводзіцца). Удакладняліся паўнамоцтвы брацтва: яно павінна было даглядаць “усе ўнутраныя і знешнія царкоўныя парадкі”. Да ўліку аб’ектаў дагляду дадаваліся святарскі і дыяканскі будынкі, школа і інш. Фундаваныя маёнткі вызваляліся ад замкавай апекі і падаткаў.

Удакладнена права дагляду за святаром: братчыкі “пад сваім прызначэннем павінны мець святара і дыякана, у іх жыцці і навуцы”, за імі замацоўвалася права пакідаць вопытных святароў, або, у іншым выпадку, іх “адхіліць”. Адначасова, пацвярджаліся намесніцкія правы святара, які меў пад сваім духоўным кіраваннем іншыя цэрквы горада і акругі, якая прылягае. Фундатар таксама загадаў, каб яго просьба адносна паўнамоцтваў намесніка і святара да львоўскага епіскапа засталася ў моцы (епіскап даваў сваё благаславенне святарам і дыяканам), прынамсі, уладыка не павінен быў супрацьстаяць фундацыям князя. Гэты парадак пашыраўся на гарадскую царкву Уздвіжання Пачэснага Крыжа [47, воп. 1, спр. 891, арк. 1–4]. Дзейнасць брацтва ў астатнія гады жыцця князя паказвае яшчэ адзін дакумент, копія якога дадана да архіўнай справы. 15 чэрвеня 1602 г. са згоды князя Аляксандра Астрожскага і епіскапа Г. Балабана, мясцовае брацтва разам са святаром пратапопам Георгіям Гаўрыловічам заклала мураваны храм каля старога драўлянага. Будаўніцтва царквы Нараджэння Гасподняга было скончана 4 верасня 1608 г. 4 студзеня 1609 г. храм асвяціў новы львоўскі епіскап Ерэмія Цісароўскі.

Як бачым, прааналізаваныя фундушы Васіля-Канстанціна Астрожскага для цярнопальскай царквы маюць вялікае значэнне.

Па-першае, яны з'яўляюцца дакладнай ілюстрацыяй падтрымкі князем брацкага руху, прычым у яго страўрапігійнай форме. Па-другое, больш выразна высвятляецца пытанне аб выкарыстанні магнатам права патранату ў сваіх маёнтках: заснаванне брацтва адбылося практычна незалежна ад епархіяльнай улады, а таксама свецкай улады Рэчы Паспалітай.

Звяртаючыся да пытання пра адсутнасць брацтваў на тэрыторыі Валыні, трэба ўлічваць і пазіцыю мясцовага ўладыкі Кірыла Цярлецкага, які, відавочна, непрыхільна ставіўся да брацкага руху [49, с. 6]. Як вядома, найстарэйшае на тэрыторыі Луцкай епархіі брацтва было заснавана пры царкве Уздвіжання Пачэснага Крыжа ў 1617 г., у 1618 г. быў пачаты брацкі памяннік. Цікава, што яго сусед (а з 1595 г. і канфесійны вораг) львоўскі ўладыка Гедэон Балабан, незважаючы на барацьбу з Успенскім брацтвам у Львове, усё ж такі засноўваў брацтвы на тэрыторыі сваёй епархіі [50, с. 34]. Гедэон Балабан спрыяў заснаванню брацтваў: у 1589 г. пры царкве Св. Фёдара Цірона ў Кракаўскім прадмесце Львова, у 1602 г. у Галагорах, у 1603 г. у Адамкавіцах каля Берэжан, у 1605 г. пры Прэабражэнскай царкве ў Магілёве, у 1606 г. Свята-Мікалаеўскае брацтва ў Замосці. Хрэстаматыйным лічыцца садзейнічанне Гедэона Балабана заснаванаму ў 1586 г. брацтву пры царкве Нараджэння Багародзіцы ў Рагаціне, з якім ён не змог наладзіць супрацоўніцтва. Не былі выключэннем і іншыя суседнія ўладыкі (напрыклад, уладзімірскі епіскап Іпацій Пацей і перамышальскі Міхаіл Капысценскі), брацтва ўзнікалі і на тэрыторыі Холмскай епархіі[7]. Нагадаю, што да пачатку 90-х гг. XVI ст. саюз князя з Кірылам Цярлецкім быў досыць паспяховы, што знайшло адлюстраванне ў выразных кроках епіскапа па шляху рэфармавання царквы [51].

Падводзячы вынікі, значным з'яўляецца тое, што сувязь князя Астрожскага з царкоўнымі брацтвамі яскрава характарызуе яго дзейнасць як пратэктара Праваслаўнай царквы. Між тым, зразумела, што гэты бок дзейнасці Васіля-Канстанціна Астрожскага не

[7] Але не існуе ніякіх сведчанняў пра заснаванне ў XVI ст. брацтваў на тэрыторыі Пінска-Тураўскай епархіі, а таксама ў паўднёвай частцы мітрапаліччай епархіі з цэнтрам у Кіеве. Адносна Пінска-Тураўскай епархіі, першае брацтва ў Пінску ўзнікла ў час Пятра Магілы. Уяўленне С. Лукашовай пра тое, што Прэабражэнскае брацтва ў Слуцку, якое было заснавана ў 1586 г., належала да Пінскай епархіі (Лукашова С.С. Миряне и церковь. С. 298), з'яўляецца памылковым, таму што Слуцк заўсёды належаў да мітрапаліччай епархіі. У XVII ст. тут была рэзідэнцыя намесніка мітрапаліта.

трэба перабольшваць ці трактаваць аднабакова. Перш за ўсё, трэба памятаваць, што гаворка ідзе пра абарону правоў Праваслаўнай царквы, якой пагражала абвяшчэнне Берасцейскай уніі 1596 г. Трэба памятаць аб тым, што ў грамадстве позняга Сярэднявечча і ранняга Новага часу выкарыстоўваліся агульнапрынятыя (у той жа час – своеасаблівыя) метады аховы, якія лічыліся для таго часу цалкам "нармальнымі". Адначасова прыведзены матэрыял пра фундаванне князем Васілём-Канстанцінам Астрожскім брацтва ў Цярнопалі патрабуе больш пільнай праверкі, таму што гаворка ідзе аб сведчаннях, якія з'яўляюцца старэйшымі за факты гістарыяграфіі адносна пачатку інстытуацыйнага развіцця брацтваў, звязаных з наданнем канстанцінопальскіх патрыярхаў.

*(Пераклад з украінскай мовы А.С. Юнгіной)*

## Спіс літаратуры

1. Likowski, E. Unia Brzeska (1596) / E. Likowski. – Poznań, 1896.

2. Lewicki, K. Książę Konstanty Ostrogski a Unja Brzeska 1596 r. / K. Lewicki – Lwów, 1933.

3. Krajcar, J. Konstantine Basil Ostrozskij and Rome in 1582–1584 / J. Krajcar // Orientalia Christiana Periodica. – Rome, 1969.

4. Ісаєвич, Я.Д. Літературна спадщина Івана Федорова / Я.Д. Ісаєвич. – Львів, 1989.

5. Іларіон (митр.). Князь Костянтин Острозький і його культурна праця / Іларіон. – Луцьк, 1992.

6. Kempa, T. Dzieje rodu Ostrogskich / T. Kempa. – Toruń, 2002.

7. Kempa, T. Konstanty Wasyl Ostrogski (ok. 1524/1525–1608) wojewoda kijowski i marszałek żiemi wołyńskiej / T. Kempa. – Toruń, 1997.

8. Kempa, T. Wobec kontrreformacji: Protestanci i prawosławni w obronie swobód wyznaniowych w Rzeczypospolitej w końcu XVI i w pierwszej połowie XVII wieku / T. Kempa. – Toruń, 2007.

9. Гудзяк, Б. Криза і реформа: Київська митрополія, Царгородський патріархат і генеза Берестейської унії / Б. Гудзяк; переклад Марії Габлевич, під ред. Олега Турія. – Львів, 2000.

10. Яковенко, Н. Топос «з'єднаних народів» у панегіриках князям Острозьким і Заславським (біля витоків української ідентичності) / Н. Яковенко // Яковенко, Н. Паралельний світ. Дослідження з історії уявлень та ідей в Україні XVI–XVII ст. / Н. Яковенко. – Київ, 2002. – С. 234–239.

11. Тимошенко, Л. Князь В.-К. Острозький і укладення Берестейської унії / Л. Тимошенко // Наукові записки. Історичні науки / Національний університет «Острозька академія». – Вип. 13: Князь Василь-Костянтин Острозький в історії України та Європи: Матеріали міжнародної наукової конференції; Острог, 15–17 жовтня 2008 р. – Острог, 2008. – С. 105–127.

12. Тимошенко, Л. Ставропігія церковних братств у контексті Берестейської унії. Історіографічний аспект / Л. Тимошенко // Confraternitas. Ювілейний збірник на пошану Ярослава Ісаєвича / Відп. Ред. М. Крикун. – Львів, 2006–2007. – Вип. 15: Україна: культурна спадщина, національна свідомість, державність / Інститут українознавства ім. І. Крип'якевича НАН України. – С. 250–267.

13. Mironowicz, A. Bractwa cerkiewne w Rzeczypospolitej / A. Mironowicz. – Białystok, 2003.

14. Лукашова, С.С. Миряне и церковь: Религиозные братства Киевской митрополии в конце XVI века / С.С. Лукашова. – М. : Институт славяноведения РАН, 2006. – 320 с.

15. Шустова, Ю.Э. Документы Львовского Успенского ставропигийского братства (1586–1788). Источниковедческое исследование / Ю.Э. Шустова. – М., 2009.

16. Мірановіч, А. Праваслалвная Беларусь / А. Мірановіч. – Беласток, 2009.

17. Monumenta Confraternitatis Stauropigianae Leopoliensis. – Leopolis, 1895. – T.1.

18. Zubrycki, O drukarniach rusko-słowiańskich / O. Zubrycki. – Lwów, 1836.

19. Крыловский, А. Львовское ставропигальное братство. (Опыт церковно-исторического исследования) / А. Крыловский. – Київ, 1904.

20. Першодрукар Іван Федоров та його послідовники на Україні (XVI – перша половина XVII ст.): Збірник документів / Упор. Я.Д. Ісаєвич, О.А. Купчинський, О.Я. Мацюк, Е.Й. Ружицький. – Київ, 1975.

21. Головацкий, Я.Ф. Львовское ставропигийское братство и князь Острожский / Я.Ф. Головацкий // Временник института ставропигийского с месяцесловом на год простый 1867. – Львов, 1866. – Год четвертый. – С. 66–84.

22. Дополнения к актам историческим / Изд. А.И. Тургенев. – Спб., 1848.

23. Documenta Unionis Berestensis eiusque auctorum (1590–1600). – Romae, 1974.

24. Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссией: в 5 т. – СПб. : Тип. Эдуарда Праца, 1846–1853. – T.IV: 1588–1632. – 1851. – 529, 25, 20 с.

25. Лукашова, С.С. Конфликт епископа Гедеона Балабана и львовского Успенского братства в 80-х гг. XVI в.: попытки реформы церкви или борьба за имущественные интересы / С.С. Лукашова // Славянский альманах: 1999 год. – М. – 2000. – С. 36–52.

26. Ісаєвич, Я.Д. Братства та їх роль в розвитку української культури XVI–XVIII ст. / Я.Д. Ісаєвич. – Київ, 1966.

27. Ваврик, В.Р. Члены Ставропигиона за 350 лет / В.Р. Ваврик // Временник: научно-латературные записки Львовского Ставропигиона на 1936 и 1937 годы. – Ч. II: Юбилейный сборник в память 350-летия Львовского Ставропигиона. – Львов, 1937.

28. Список замечательнейших лиц, вписавшихся в книгу Львовского братства, со времени основания сего братства Антиохийским патриархом Іоакимом в 1586 году // Памятники, изданные Временною комиссиею для разбора древних актов, высочайше учрежденною при Киевском, Подольском и Волынском генерал-губернаторе. – Киев, 1852. – Т.3.

29. Головацкий, Я.Ф. Хронологическая роспись вписных братий прежде братства Львовского Успения Пресвятыя Богородицы, ныне же Института Ставропигийского / Я.Ф. Головацкий // Временник Института Ставропигийского с месяцесловом на 1864 год. – Львов, 1864. – Р. 1. – С. 81–91.

30. Шараневич, И. Исторический очерк о Ставропигийской церкви Успения Пресвятой Богородицы во Львове. Введение / И. Шараневич // Юбилейное издание в память 300-летнего основания Львовского Ставропигийского братства. – Львов, 1886. – Т.1.

31. Капраль, М. Національні громади Львова XVI–XVIII ст. (соціально-правові взаємини) / М. Капраль. – Львів, 2003.

32. Голубев, С. Киевский митрополит Петр Могила и его сподвижники (Опыт исторического исследования) / С. Голубев // Материалы для истории Западно-Русской Церкви (Приложение к 1-му тому сочинения). – Киев, 1883. – Т. 1 .

33. Gil, A. Chełmska diecezja unicka 1596–1810. Dzieje i organizacja / A. Gil. – Lublin, 2005.

34. Петрушевич, А. Сводная Галицко-Русская Летопись с 1600 по 1700 год / А. Петрушевич. – Львов, 1874.

35. Kempa, T. Wileńskie bractwo Sw. Ducha jako centrum obrony prawosławia w Wielkim Księstwie Litewskim w końcu XVI i w pierwszej połowie XVII w. / T. Kempa // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 2004. – T. 21. – S. 47–69.

36. Реестр уписования братий братства церковного Святои Живоначальнои Тройци, олтаря Стретения Господня, в месте Виленском, року от вополощения Господа Бога и Спаса нашего Иисуса Христа 1584 // Чтения в Императорском Обществе истории и древностей российских при Московском университете. – 1859. – Кн. 3: Материалы славянские. – С. 29–40.

37. Описание документов архива западнорусских униатских митрополитов. – СПб., 1897. – Т. I.

38. Тимошенко, Л. Берестейська унія 1596 р. / Л. Тимошенко. – Дрогобич, 2004.

39. Kempa, T. Współpraca prawosławnych i ewngelików na terenie Wilna w latach 1596–1603 // Silva rerum nowa. Штудыі у гонар 70-годдзя Георгія Я. Галенчанкі // Уклад. А. Дзярнович, Альбіна Семянчук; рэдкал.: Алег Дзярновіч (адказны сакратар). – Вільня-Мінск, 2009.

40. Archiwum domu Sapiehów wydane staraniem rodziny / Opracował Dr. A. Prochaska. – Lwów, 1892. – T. I : Listy z lat 1575–1606. – XXXV, 577 s.

41. Русская историческая библиотека издаваемая археографическою комиссиею: в 25 т. – СПб., 1872–1908. – Т. XIX. Кн. 3: Памятники полемической литературы в Западной Руси. – 1903. – XIII, 600, 104, 91 с.

42. Ліст братчыкаў да Януша Астрожскага 30 снежня 1608 г. з Вільны // Archiwum Główne Akt Dawnych. – Archiwum Publiczne Potockich. – Sygn. 9. – T. 1.

43. Терлецький, О. Василь-Костянтин князь Острозький. Історія фундації князя Острозького в Тернополі / О. Терлецький. – Тернопіль, 1909.

44. Мицько, І. Острозька слов'яно-греко-латинська академія (1576–1636) / І. Мицько. – Київ, 1990.

45. Володіння князів Острозьких на Східній Волині (за інвентарем 1620 року) / Переклад, упорядкування і передмова Ірини Ворончук. – Київ-Старокостянтинів, 2001.

46. Скочиляс, І. Генеральні візитації Київської унійної митрополії XVII–XVIII століть. Львівсько-Галицько-Кам'янецька єпархія / І. Скочиляс. – Львів, 2004. – Т. 2: Протоколи генеральних візитацій.

47. Центральний державний історичний архів України у Львові. – Ф. 408. – Оп. 1.

48. Dzieduszycki, L. Tarnopol / L. Dzieduszycki // Słownik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich / Red. F. Sulimierski, B. Chlebowski, W. Walewski. – Warszawa, 1892. – T.XII. – S. 188–189.

49. Пом'яник. Волинське крайове Братство святого Апостола Андрія Первозданного (Луцьке Хрестовоздвиженське): Від року Божого 1618-го і далі / редкол. О. Бірюліна, А.Бондарчук, М.Хілько. – Луцьк, 2000.

50. Degiel, R. Protestanci i prawosławni / R. Degiel. – Warszawa, 2000.

51. Тимошенко, Л. Діяльність єпископа Кирила Терлецького на уряді Луцько-Острозької кафедри / Л. Тимошенко // Studia z dziejów i tradycji metropolii kijowskiej XII–XIX wieku / Red. A. Gil. – T. 5 : Studia i materiały do dziejów chrześcijaństwa wschodniego w Rzeczypospoilitej. – Lublin, 2009. – S. 193–211.